Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛЮТАГА 2014 г. ПЯТНІЦА № 23 (27633) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Нашы ў Сочы: спадзяванні і шанцы

СТАР.8

Правілы высокага абцаса

СТАР.8

Аляксандр Лукашэнка наведае цырымонію адкрыцця XXII зімовых Алімпійскіх гульняў у Сочы

Пачынаецца візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Расійскую Федэрацыю. Па запрашэнні Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна Аляксандр Лукашэнка наведае цырымонію адкрыцця XXII зімовых Алімпійскіх гульняў у Сочы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Праграмай візіту таксама прадугледжаны шэраг міжнародных сустрэч. Акрамя таго, запланаваны мерапрыемствы па пытаннях далейшага развіцця інфраструктуры беларускіх аб'ектаў у Сочы і Краснай Паляне.

(Працяг тэмы на 8-й стар.)

СТВОРАНЫ РАБОЧЫЯ ГРУПЫ ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМНЫХ ПЫТАННЯЎ У ЖКГ І АПК

Прэзідэнт Беларусі стварыў рабочыя групы для вырашэння праблемных пытанняў у ЖКГ і АПК. Адпаведныя распараджэнні Аляксандр Лукашэнка падпісаў 4 лютага, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Вывучэннем праблемных пытанняў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы зоймецца рабочая група пад кіраўніцтвам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Якабсона.

У склад рабочай групы ўключаны кіраўнікі шэрагу рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама кіраўнікі асобных навуковых і праектных арганізацый, якія ведаюць праблемы галіны.

СТАР.2

Заслужаным людзям — заслужаныя ўзнагароды

За шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў і высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у развіццё энергетычнай сістэмы, лясной і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя, дасягненні ў галіне адукацыі, мастацтва і культуры Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўдастоіў дзяржаўных узнагарод заслужаных людзей краіны. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны загадчык нейрахірургічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Арнольд Смеяновіч.

Артыст, вядучы майстар сцэны Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача Барыс Барысёнак і першы прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова Міхаіл Вішнеўскі адзначаны ордэнам Францыска Скарыны.

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны 35 чалавек.

Загадчыца філіяла і намеснік дырэктара па навуковай рабоце Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Валянціна Афанасенка і Людміла Навумава адзначаны медалём Францыска Скарыны. Гэтай жа ўзнагароды ўдастоены мастак-графік Уладзімір Васюк, мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Тарас Паражняк, член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў» Рыгор Сурус, дырэктар Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў Анатоль Собаль, артыст-вакаліст (саліст) Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Ганна Сцепанкова. Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны таксама настаўнік фізікі мінскай гімназіі №29 Генадзь Кемброўскі, загадчык кафедры гастраэнтэралогіі і нутрыцыялогіі БелМАПА Юрый Марахоўскі, дэкан фізіка-матэматычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова Леанід Старавойтаў, дацэнт кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Аляксандр Фінскі.

Ганаровае званне заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь прысвоена дырыжору Ансамбля танца, музыкі і песні «Белыя росы» Аляксандру Аўрукевічу, артысту, вядучаму майстру сцэны Брэсцкага тэатра лялек Івану Герасевічу, вядучаму майстру сцэны тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Аляксандру Кашпераву.

Ганаровае званне заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь прысвоена мастаку-жывапісцу Валерыю Шкарубу, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь — кіраўніку заслужанага аматарскага калектыву ансамбля танца «Равеснік» Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў Таццяне Семчанка.

Дырэктару мінскай гімназіі №22 Ларысе Адашкевіч прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь», загадчыцы кафедры бухгалтарскага ўліку, аналізу і аўдыту ў АПК і транспарце Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Пелагеі Папкоўскай і загадчыку кафедры беларускай мовы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова Васілю Рагаўцову прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

Фота БЕЛТА.

Факсімільнае выданне Полацкага Евангелля канца XII ст. выдавецтва Беларускага Экзархата.

МАСТАЦТВА КНІГІ — ДЗЕЦЯМ І ДАРОСЛЫМ

У Мінску выбралі найлепшыя кнігі, сярод якіх ілюстраваныя выданні для самых маленькіх і праекты выдавецкага дома «Звязда»

У Мінску прайшло традыцыйнае ўзнагароджанне найлепшых кніг. Іх вызначылі ў межах 53-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», які ладзіцца з 1960-га года і падводзіць вынікі працы айчынных кнігавыдаўцоў. Узнагароджанне адбылося ў малой зале Палаца рэспублікі ў рамках XXI Міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу. Гэтым разам у конкурсе «Мастацтва кнігі» ўзяло ўдзел 31 выдавецтва, 134 выданні павышанай якасці.

Гран-пры конкурсу (намінацыя «Трыумф») атрымала факсімільнае выданне Полацкага Евангелля канца XII ст. выдавецтва Беларускага Экзархата.

Асаблівую ўвагу заўсёды прыцягваюць пераможцы ў намінацыі «ЛІТ-фармат». Гэта выданні літаратурна-мастацкага кірунку. Сёлета найлепшымі сталі серыі кніг «Маладзік» і «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» выдавецтва «Мастацкая літаратура». А вось пераможцамі ў намінацыі «Разам з кнігай мы расцём» стала серыя гэтага ж выдавецтва «Нашым дзеткам», у якой выйшлі, напрыклад, кнігі Рыгора Барадуліна («Сябрыня») і Раісы Баравіковай («Ты не слухай Мішку, коцік»). Гэта новая, даволі эксперыментальная серыя: тонкія кніжкі, праілюстраваныя маладымі мастакамі. Глядзяцца яны, трэба адзначыць, даволі годна.

Фотаальбом «Мінск. Сэрца Беларусі» выдавецтва «Беларусь» стаў пераможцам у намінацыі «Фотапогляд». А найлепшымі ў намінацыі «АРТ-кніга» (выданні па выяўленчым мастацтве, факсімільныя, рэпрынтныя, бібліяфільскія выданні) сталі кнігі Уладзіміра Сцяпана «Настаўнік Сяргей Пятровіч Каткоў» і альбом рэпрадукцый мастака Сяржука Цімохава, якія пабачылі свет у выдавецкім доме «Звязда».

У намінацыі «Эўрыка», якую атрымліваюць навуковыя і навукова-папулярныя выданні, перамагла кніга Вольгі Лабачэўскай «Беларускі народны тэкстыль: мастацкія асновы, узаемасувязі, навацыі» (выдавецкі дом «Беларуская навука»). У намінацыі «Падручнік новага веку» пераможнай стала серыя вучэбных выданняў выдавецтва «Аверсэв».

А вось у намінацыі «Духоўнасць» адзначылі кнігу «Кніжная культура. Ветка» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі».

СТАР.2

Лаўрэаты конкурсу «Мастацтва кнігі».

Фота Надзеі БУЖАН.

ЛІЧБА ДНЯ

На 1,7 тоны

вырас залаты запас Нацыянальнага банка Беларусі за 2013 год і дасягнуў 35 т, згодна з данымі на 1 студзеня 2014 года. Пры гэтым за першае паўгоддзе залаты запас павялічыўся на 500 кг, за другое — вырас на 1,2 т. Прырост быў забяспечаны за кошт набыцця золата на ўнутраным і міжнародным рынках, а таксама за кошт рэструктурызацыі залатога запасу. За 2012 год залаты запас Нацыянальнага банка павялічыўся на 1,6 т і склаў 33,3 т на 1 студзеня 2013 года. Залаты запас Нацбанка Беларусі вылічаецца ў тонах і змяшчае золата, а таксама серабро, плаціну і паладый.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.02.2014 г.

Долар ЗША	9660,00	■
Еўра	13060,00	▲
Рас. руб.	278,00	▲
Укр. грыўня	1100,85	▲

■ Надвор'е

ВІЛЬГОТНАЕ ДЫХАННЕ АТЛАНТЫКІ

У выхадныя чакаецца да 7 цяпла

Гэтымі днямі на тэрыторыю Беларусі працягнуць паступаць больш вільготныя паветраныя масы з боку Польшчы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ў пятніцу, пераважна па ўсходзе краіны, пройдуць невялікія ападкі (мокры снег і дождж). Месцамі туман, галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Прагназуецца, што на выхадныя ўплыў Атлантыкі яшчэ ўзмоцніцца. Уначы месцамі, а ўдзень амаль паўсюдна будзе ісці мокры снег і дождж. У асобных раёнах туман і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы на 8 і 9 лютага складзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса, пры праясненнях — да 7 марозу. Удзень на выхадныя чакаецца ўжо ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, а па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей — да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пачатку наступнага тыдня часам будзе ісці мокры снег і дождж, прагназуецца туман, слабы галалёд і галалёдзіца на дарогах. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак стане ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад 0 да плюс 6 градусаў. А вось вяртанне нейкіх сур'ёзных маразоў у лютым сіноптыкі пакуль не прадказваюць... Можа, хутка вясна?

Сяргей КУРКАЧ.

■ Вы прасілі расказаць

УСЁ ПРА БАЛЬНІЧНЫЯ ЛІСТЫ

З нядаўняга часу бальнічныя лісты пачалі аплачвацца па-новаму. На гарачы тэлефон і ў аддзел пісьмаў «Звязды» ў сувязі з гэтым паступае нямала пытанняў. Пракаменціраваць для нашых чытачоў асноўныя змены ў правілах іх аплаты і расставіць усе кропкі над «і» мы папрасілі начальніка аддзела сацыяльнага страхавання Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ларысу КАПЫЛЬСКУЮ.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Што змянілася

Сярод асноўных змяненняў пры назначэнні дапамогі па часовай непрацаздольнасці можна вылучыць наступныя:

— Дапамога прызначаецца не за працоўныя дні, як раней, а за каляндарныя дні часовай непрацаздольнасці.

Гэта значыць, выхадныя дні, праведзеныя ў змаганні з хваробай, зараз таксама аплачваюцца.

— Дапамогі па часовай непрацаздольнасці ў сувязі з захворваннем або траўмай у быце зараз прызначаюцца ў памеры 80% сярэднядзённага заробку за першыя 12 каляндарных дзён часовай непрацаздольнасці.

Як растлумачыла спецыяліст, дапамога па часовай непрацаздольнасці — гэта сацыяльная выплата, а не заробак. Важна, што вышэйзгаданая норма не закранае людзей, якія страцілі заробак з прычыны цяжкага захворвання або траўмы ў быце, таму што, пачынаючы з 13-га дня часовай непрацаздольнасці, дапамога прызначаецца ў памеры 100% незалежна ад працягласці выпадку часовай непрацаздольнасці. Адзіны нюанс — гэта павінен быць бесперапынны бальнічны ліст.

— Сярэднядзённы заробак для налічэння дапамогі па часовай непрацаздольнасці вылічваецца згодна з агульным правілам за 6 каляндарных месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу ўзнікнення права на дапамогу.

Парадак вылічэння сярэднядзённага заробку, які дзейнічаў раней (за 2 каляндарныя месяцы), паводле слоў Ларысы Капыльскай, не дазваляў дакладна ўвязаць памер дапамогі з велічынёй страчанага заробку.

СТАР.2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ЗАКЛІКАЛА АБВЯСЦІЦЬ АЛІМПІЙСКАЕ ПЕРАМІР'Е

Спецыяльную заяву МЗС Расіі апублікавала на сайце знешнепалітычнага ведамства. «Расійская Федэрацыя ў якасці арганізатара зімовай Алімпіяды настойліва заклікае ўдзельнікаў усіх узброеных канфліктаў, незалежна ад краін і кантынентаў, аб'явіць на гэты час алімпійскае перамір'е», — гаворыцца ў заяве. У першую чаргу заклік звернуты да бакоў кровапралітнага канфлікту ў Сірыі, які сур'ёзна дэстабілізуе не толькі становішча ў гэтай краіне, але і ў рэгіёне ў цэлым, адзначаецца ў дакуменце.

ВАТЫКАН ВЫЯВІЎ ГЕЙ-ЛОБІ Ў КАМІСІІ ААН

Ватыкан выступіў з афіцыйнай заявай, у якой выказаў здагадку пра наяўнасць сувязяў паміж камісіяй ААН па правах дзяцей і арганізацыямі, якія адстойваюць правы сэксуальных меншасцяў, паведамляе Reuters. Такім стаў адказ Святога прастола на заключэнне камісіі аб злачынствах супраць дзяцей, нібыта ўчыненых з ведама Ватыкана. Аўтары гэтага дакумента прысвяцілі яго частку крытыцы пазіцыі каталіцкай царквы па пытаннях кантрацэпцыі, гомасэксуальнасці і абортаў. У Ватыкане адзначылі, што гэтыя праблемы наогул не маюць ніякага дачынення да абароны правоў дзяцей, але чамусьці апынуліся ў дакладзе з разгромнай крытыкай Царквы, падрыхтаваным камісіяй ААН па правах дзяцей. У сувязі з гэтым Святы прастол выказаў здагадку, што складальнікі дакумента «ідэалагічна матываваныя» і не столькі адстойваюць правы дзяцей, колькі займаюцца падтасоўваннем фактаў і сведчанняў. «Святы прастол прыме да ўвагі высновы гэтага даклада, аднак са шкадаваннем адзначае, што дакумент з'яўляецца спробай умяшання ў пытанні веравучэння каталіцкай царквы аб годнасці чалавека. Ватыкан яшчэ раз пацвярджае сваю прыхільнасць ахове і абароне правоў дзіцяці», — цытуе заяву Святога прастола BBC News.

НАЗВАНЫ ПРАФЕСІІ, ПРАДСТАЎНІКІ ЯКІХ ЧАСЦЕЙ ХВАРЭЮЦЬ НА РАК СКУРЫ

Фермеры, гандляры, будаўнікі і кіроўцы знаходзяцца ў групе павышанай рызыкі развіцця раку, высветліў Інстытут медыцынскіх даследаванняў Гары Перкінса і Універсітэт Заходняй Аўстраліі. Прынята лічыць, што рак скуры часта выяўляюць у людзей, якія злоўжываюць сонечнымі ваннамі або салярыем. Але на самой справе ў небяспецы той, хто не па сваёй волі знаходзіцца на сонцы. Медыкі нагадваюць: небяспечнае не толькі само сонца, але і паверхні, якія яго адлюстроўваюць. Гаворка ідзе пра дахі, паверхню вады, шкло, шыбы ў машыне.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ГЛАЗЬЕЎ НАЗВАЎ ВЫДАТКІ АМЕРЫКАНЦАЎ НА ЎЗБРАЕННЕ «МАЙДАНАЎЦАЎ»

Амерыканскія крыніцы штотыдзень выдаткоўваюць па 20 мільёнаў долараў «на фінансаванне, у тым ліку на ўзбраенне, апазіцыі і мяцежнікаў». Пра гэта, каментуючы сітуацыю ва Украіне, заявіў саветнік прэзідэнта РФ Сяргей Глазьеў. Ён паведаміў таксама, што на тэрыторыі амерыканскага пасольства «праходзяць інструктаж баевікі». Адкуль менавіта атрымана гэтая інфармацыя, Глазьеў не ўдакладніў. У цэлым тое, што адбываецца ва Украіне, Глазьеў ахарактарызаваў як спробу дзяржаўнага перавароту, якая ажыццяўляецца пры падтрымцы Захаду. «Мяркуючы па ўсім, Штаты зрабілі стаўку на сцэнар гвалтоўнага звяржэння ўлады», — мяркуе ён.

КОРАТКА

У пенсійную сістэму Беларусі ў 2013 годзе ўліліся амаль 127,9 тыс. чалавек (76,8 тыс. жанчын і 51,1 тыс. мужчын). Колькасць атрымальнікаў пенсій у краіне на 1 студзеня бягучага года склала 2 млн 537,3 тыс. чалавек.

Конкурсны адбор патэнцыяльных пакупнікоў дзяржаўнай долі ў СТАА «МТС» не адбыўся з-за адсутнасці заяў ад інвестараў. У снежні паведамлялася аб пачатковай цане долі «МТС» (51 працэнт) у памеры $863 млн, раней яна складала $1 млрд.

Памятны знак у Светлагорскім раёне, дзе пачыналася аперацыя «Баграціён» па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, з'явіцца ў бягучым годзе ў Гомельскай вобласці.

У Мінску 14 лютага пройдзе акцыя льготнага лячэння людзей, якія церпяць ад алкагольнай залежнасці, метадам кадзіравання або падшыўкі.

Рознічны тавараабарот гандлёвай сеткі «Еўраопт» за 2013 год перасягнуў $1,9 млрд. Гэты паказчык прыкладна на 20 працэнтаў меншы за тавараабарот Белкаапсаюза за мінулы год, але разрыў нязменна скарачаецца.

■ Праблемнае суседства

ЗУБР — НЕ КАРОВА, АЛЕНЬ — НЕ КАЗА,

але кормяць жывёлу нярэдка... калгасы

Якое гэта прыгожае відовішча, калі грацыёзны алень раскідвае капытам снег і дастае адтуль зялёныя галінкі азімага рапсу! Глядзець можна доўга, можна здымаць на відэа, калі пашанцуе. А мы вось не паспелі нават сфатаграфаваць: як толькі машына дырэктара ААТ «Роўбіцкае» спынілася насупраць маленькага статку аленяў, чуллівыя жывёліны адразу адбеглі да бліжэйшага ўзлеску і схаваліся за дрэвамі.

Стратная экзотыка

— Як знарок пахваліся, — здзіўляецца дырэктар роўбіцкай гаспадаркі Мікалай Пстыга. — Бывае, едзеш па гэтай дарозе — ледзь не з-за кожнага дрэва то зубры выглядваюць, то алені з казулямі...

Тут жа спрактыкаваным вокам дырэктар заўважае на краю лесу лісу, але я паспяваю ўбачыць толькі рыжы хвост.

Што тут скажаш? Насельнікі Белавежскай пушчы жывуць сваім жыццём, галоўным складнікам якога з'яўляецца здабыванне ежы. Асабліва гэта актуальна студзеньска-лютаўскімі маразамі, калі звычайная кармавая база пад снегам.

СТАР.6

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.